| *Глинка М.* | Баркарола |
| | Детская полька |
| | Мазурка |
| | Ноктюрн (обр. В. Борисовского) |
| *Глиер Р.* | Вальс,Соч. 31(перелож. Е. Страхова) |
| | Ноктюрн,Соч. 35 |
| | Вальс,Соч. 45 (перелож. В. Борисовского) |
| *Глюк К.* | Гавот (обр. В. Борисовского) |
| *Гранадос Э.* | Интермеццо (обр. В. Борисовского) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| *Григ Э.* | Вальс,Соч. 38, № 6 (переел. Е. Страхова)<br>Поэма,Соч. 43, № 5<br>Вечер в горах, Соч. 68 (перелож.Ф. Дружинина)<br>Песня Сольвейг (обр. В. Борисовского)<br>Листок из альбома (перелож.Г. Безрукова) |
| *Гурилев Л.* | Полька-мазурка (обр. В. Борисовского) |
| *Даргомыжский А.* | Элегия (обр. В. Борисовского) |
| *Дебюсси К.* | Девушка с волосами цвета льна<br>В лодке<br>Лунный свет (обр. В. Борисовского)<br>Менуэт<br>Медленный вальс<br>Чудный вечер<br>Вереск и Менестрели (обр. и перелож.Е. Страхова) |
| *Есаулов А.* | Меланхолический вальс (обр. В. Борисовского) |
| *Жонген Ж.* | Элегическая поэма |
| *Ибер Ж.* | Меланхолический вальс (обр. В. Борисовского) |
| *Иоахим И.* | Вариации |
| *Ипполитов-Иванов М.* | Испанская серенада |
| *Кабалевский Д.* | Импровизация |
| *Каминский Д.* | Юмореска |
| *Караев К.* | Адажио и Китайский танец из балета «Семь красавиц» (концертная обр. В. Борисовского). |
| *Киль Ф.* | Три романса |
| *Киркор Г.* | Ноктюрн и Рондо (ред. Г. Талаляна) |
| *Ковалев В.* | Поэма (ред. Г. Талаляна) |
| *Кодаи З.* | Адажио |
| *Компанеец З.* | Поэма-монолог (ред. партии альта В. Борисовского) |
| *Компаньоли-Бажевич* | Тема с вариациями |
| *Крейн А.* | Пролог,Соч. 2 а |
| *Крюков В.* | Элегия, Новелла,Соч. 13<br>Павана,Соч. 20 |
| *Кюи И.* | Аппассионата |
| *Лист Ф.* | Два сонета Петрарки № 47, 104 (концертная обр. Е. Страхова)<br>Романс<br>Ноктюрн<br>Поэма<br>Прощание<br>Сонет Петрарки № 123 (концертная обр. В. Борисовского) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| *Лядов А.* | Прелюдия,Соч. 11, № 1(обр. В. Борисовского) |
| | Прелюд, Мазурка, Вальс,Соч. 57, № 1(обр. Е. Страхова) |
| *Лятошинский Б.* | Ноктюрн |
| | Скерцино |
| | Марш |
| | Сюита |
| *Массне Ж.* | Элегия (обр. В. Борисовского) |
| *Медынь Я.* | Вальс |
| | Баллада |
| | Рондино |
| *Мендельсон Ф.* | Две песни без слов |
| | Весенняя песнь |
| | Осенняя песнь (перелож.В. Борисовского) |
| *Монасыпов А.* | Романс |
| *Моцарт В. А.* | Анданте (перелож.Ф. Дружинина) |
| *Мусоргский М.* | Гопак (обр. В. Борисовского) |
| *Мясковский Н.* | Конец сказки |
| *Няга Д.* | Инвенция |
| *Одоевский В.* | Вальс |
| *Орфеев С.* | Романс |
| *Персикетти У.* | Инфанта Марина |
| *Прокофьев С.* | Скерцино,Соч. 52, № 4(перелож. Е. Страхова) |
| | Танец девушек с лилиями из балета «Ромео и Джульетта», Соч. 64 (перелож.Е. Страхова) |
| | Пьесы из балета «Ромео и Джульетта»: Вступление, Улица просыпается, Джульетта-девочка, Менуэт («Съезд гостей»), Танец рыцарей, Сцена у балкона, Меркуцио, У патера Лоренцо,Соч. 64 (концертная обр. В. Борисовского) |
| | Колыбельная из оратории «На страже мира» |
| *Паганини Н.* | Соната |
| *Перселл Г.* | Сюита |
| *Равель М.* | Павана |
| | Пьеса в форме хабанеры |
| *Рахманинов С.* | Прелюдия, Соч. 24 |
| | Вокализ, Пляска цыган,Соч. 34 |
| | Мелодия, Серенада,Соч. 3 |
| *Регер М.* | Романс |
| *Римский-Корсаков Н.* | Полет шмеля |
| | Пляска скоморохов |
| | Ария Шемаханской царицы |
| | Песнь индийского гостя |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| *Ролла А.* | Адажио и тема с вариациями |
| | Вариации |
| | Концертный этюд |
| *Россини Дж.* | Скерцо |
| *Скрябин А.* | Прелюдия,Соч. 9, № 1 |
| *Слонимский С.* | Две пьесы |
| *Степанов Л.* | Вокализ |
| *Степанова В.* | Поэма |
| *Стравинский И.* | Пастораль |
| | Элегия |
| *Турина А.* | Анданте из сюиты «Севилья» |
| *Фаркаш Ф.* | Румынские народные танцы |
| *Флосман О.* | Камень Микелеанжело |
| *Форэ Г.* | Пробуждение |
| *Фрид Г.* | Шесть пьес для альта и фортепиано |
| *Хачатурян А.* | Вальс |
| *Хиндемит П.* | Траурная музыка |
| *Цинцадзе С.* | Романс |
| | Хоруми |
| *Шапорин Ю.* | Пять пьес, Соч. 25 |
| *Шварц Л.* | Башкирская мелодия |
| | Узбекская плясовая (перелож.В. Борисовского) |
| *Шопен Ф.* | Этюд, Соч. 25, № 2 |
| | Вальс, Соч. 28, № 2(обр. В. Борисовского) |
| | Вальс, Соч. 62, № 2 |
| | Мазурка,Соч. 67, № 4 (перелож. Е. Страхова) |
| | Ноктюрн (перелож.Ф. Дружинина) |
| *Шостакович Д.* | Пьесы из музыки к кинофильму «Овод»: Увертюра, Романс, Контрданс, Вальс-шарманка, Ноктюрн, Галоп (обр. В. Борисовского). |
| *Шуберт Ф.* | Два вальса, Соч. 9 |
| | Экспромт, Скерцо, Пчелка,Соч. 90, № 3 (обр. В. Борисовского). |
| | Серенада |
| *Шуман Р.* | Грезы,Соч. 15, № 7 |
| | Вечерняя песнь,Соч. 85, № 12 |
| | Четыре пьесы,Соч. 113 |
| *Энеску Ж.* | Концертная пьеса |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.5 Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Існуюць розныя формы дыягносцікі ведаў: залік, экзамен, дзяржаўны экзамен, акадэмічны канцэрт, справаздачны канцэрт кафедры, канцэрт класа выкладчыка кафедры, масцер клас, адкрыты ўрок, тэматычны канцэрт, конкурсы, фестывалі, канцэрты ў рамках афіцыйных мерапрыемстваў.

Адпаведна навучальнаму плану на дзённай форме адукацыі, залікі і экзамены праводзяцца ў 1 -8 семестрах. У 8 семестры ідзе падрыхтоўка канцэртнай праграмы і выкананне яе на дзяржаўным экзамене. Тэхнічныя залікі праводзяцца ў 1, 3, 5 семестрах. Акадэмічныя канцэрты ў 2, 4, 6 семестрах. Срокі правядзення ўстанаўлівае кафедра.

На завочнай форме адукацыі залікі і экзамены праводзяцца ў 1 -10 семестрах. У 10 семестры таксама ідзе падрыхтоўка і выкананне канцэртнай праграмы на дзяржаўным экзамене.

Студэнт мае магчымасць выступаць з адкрытымі сольнымі канцэртамі, якія па рашэнню кафедры залічваюцца як акадэмічны канцэрт, або экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.6 Крытэрыі адзнак вынікаў вучэбнай дзейнасці

*1(адзін)* Адмова ад выканання праграмы, адсутнасць прырашчэння ведаў і кампетэнтнасці ў рамках адукацыйнага стандарту.

*2(два)* Фрагментарныя веды; наяўнасць ў выкананні праграмы грубых і лагічных памылак; пасіўнасць на занятках, адсутнасць інтанавання; нізкі ўзровень культуры выканання музычных твораў.

*3(тры)* Нядосыць поўны аб'ём ведаў; выкананне музычных твораў з істотнымі і лагічнымі памылкамі; слабае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў, пасіўнасць на занятках, не дакладнае інтанаванне; нізкі ўзровень музычнай культуры выканання ігры на інструменце.

*4(чатыры)* Выкананне музычнай праграмы, без істотных памылак; валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства на інструменце; не дакладнае валоданне тэхнічнымі прыёмамі, музыкальна-выканальніцкай тэхнікай ігры на інструменце; не стабільнае інтанаванне, дапушчальны ўзровень выканальніцкай культуры ігры на інструменце.

*5(пяць)* Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства; лагічнае мысленне музычнай формы; выкарыстоўванне шматлікіх тэхнічных сродкаў і прыёмаў; не дастатковая гнуткасць музычнага мыслення; не дакладнае гуказдабыванне, інтанаванне; добры ўзровень выканальніцкай музычнай культуры ігры на інструменце.

*6(шэсць)* Досыць поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; прысутнасць комплекса музычных здольнасцей (інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); досыць свабоднае валоданне інструментам, музычнае мысленне, музыкальны густ.

*7(сем)* Наяўнасць комплекса музычных здольнасцей (стабільнае інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); свабоднае валоданне музыкальна-выканальніцкай тэхнікай ігры на інструменце; засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры; высокі ўзровень музычнай культуры выканання праграмы.

*8(восем)* Вельмі дакладнае інтанаванне, адчуванне рытму, і г.д.); свабоднае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў; якаснае гуказдабыванне; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры; актыўная самастойная праца і сістэматычны ўдзел ў розных канцэртных мерапрыемствах; высокі музычна-мастацкі густ выканання

*9(дзевяць)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на інструменце; наяўнасць музычных здольнасцей (дасканалае інтанаванне, якаснае гуказдабыванне, артыкуляцыя штрыхоў, рытмічных узораў, баланс гучання, і г.д.); наяўнасць мабілізацыі ўвагі, канцэнтрацыі творчых сіл, сваіх адносін да выканання, інтэрпрытацыі, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10(дзесяць)* Бездакорнае выкананне праграмы; інтэрпрытацыя музычнага твора, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ, дасканалае гуказдабыванне, асэнсаваны рытм, баланс гучання, дынаміка, тэмп; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры ў рамках вучэбнай праграмы; устойлівае інтанаванне; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы пры выкананні музычных твораў.

## 4.7 Патрабаванні да выніковай атэстацыі

Дзяржаўны экзамен па дысцыпліне "Спецінструмент" (скрыпка, альт) праводзіцца па заканчэнні срока навучання, у канцы IV курса (8-га семестра). Экзамен з'яўляецца дэманстрацыяй выканаўчага майстэрства, набытага ў перыяд навучання ва ўніверсітэце. Выпускнік таксама павінен прадыманстраваць сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на інструменце; прафесійнае выкананне праграмы; інтэрпрытацыі музычных твораў, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ, дасканалае гуказдабыванне, інтанаванне, асэнсаваны рытм, баланс гучання, дынаміку, тэмп; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы пры выкананні экзаменацыйнай праграмы.

У час экзамена студэнт выконвае тры творы рознага характару:

– буйной формы (1, ці 2 часткі канцэрта; санату цалкам, варыяцыі; разгорнутую канцэртную пьесу)

– 2 пьесы малой формы, (адна з іх абавязкова ў стылю джаз, другая магчыма быць у іншым папулярным выканаўчым стылі).

– Выкананне пьес пажадана ў суправаджэнні ансамбля (рытм-секцыі), ці з фанаграмай.

– Прывітаецца выконванне твораў уласнага стварэння і ўласных імправізацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.8 Крытэрыі адзнак вынікаў Дзяржаўнага экзамена

*1(адзін)* Адмова ад выканання праграмы, адсутнасць прырашчэння ведаў і кампетэнтнасці ў рамках адукацыйнага стандарту.

*2(два)* Нізкі ўзровень культуры выканання музычных твораў; наяўнасць у выкананні праграмы грубых памылак; дрэннае гуказдабыванне, інтанаванне, штрыхі.

*3(тры)* Выкананне музычных твораў з істотнымі і лагічнымі памылкамі; слабае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў, дрэннае гуказдабыванне, інтанаванне; нізкі ўзровень музычнай культуры выканання ігры на інструменце.

*4(чатыры)* Выкананне музычнай праграмы, без істотных памылак; валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства на інструменце; не дакладнае валоданне тэхнічнымі прыёмамі; дрэннае гуказдабыванне, інтанаванне; дапушчальны ўзровень выканальніцкай культуры ігры на інструменце.

*5(пяць)* Валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства; выкарыстоўванне радам тэхнічных сродкаў і прыёмаў; не дастатковая гнуткасць музычнага мыслення; не дакладнае гуказдабыванне, голасавядзенне, інтанаванне; добры ўзровень выканальніцкай музычнай культуры ігры на інструменце.

*6(шэсць)* Добры ўзровень выканальніцкай музычнай культуры ігры на інструменце; прысутнасць комплекса музычных здольнасцей (інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); досыць свабоднае валоданне інструментам, музычнае мысленне, музыкальны густ; не дасканалыя сродкі выразнасці рэалізацыі мастацкай задумы аўтара.

*7(сем)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўная веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве; наяўнасць комплекса музычных здольнасцей (інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); добрае валоданне музыкальна-выканальніцкай тэхнікай ігры на інструменце; высокі ўзровень музычнай культуры выканання праграмы.

*8(восем)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве; наяўнасць комплекса музычных здольнасцей (дакладнае інтанаванне, адчуванне рытму, і г.д.); свабоднае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў; здольнасць самастойна вырашаць складаныя выканальніцкія задачы ў рамках канцэртнага выступлення; высокі музычна-мастацкі густ выканання.

*9(дзевяць)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на інструменце; наяўнасць музычных здольнасцей (дасканалае інтанаванне, артыкуляцыя штрыхоў, рытмічных узораў, баланс гучання, і г.д.); наяўнасць мабілізацыі ўвагі, канцэнтрацыі творчых сіл, сваіх адносін да выканання, інтэрпрытацыі, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ; актыўная выканальніцкая пазіцыя, артыстызм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10(дзесяць)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на інструменце; бездакорнае выкананне праграмы; інтэрпрытацыя музычнага твора, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ, дасканалае гуказдабыванне, асэнсаваны рытм, баланс гучання, дынаміка, тэмп; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы пры выкананні музычных твораў; артыстызм; наяўнасць індывідуальнага выканальніцкага стыляю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тыпавая вучэбная праграма

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
___________________А.І.Жук
"___"_____________2010 г.
Рэгістрацыйны № ТД-____/тып.

**СПЕЦІНСТРУМЕНТ**
**(скрыпка, альт)**

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці**
1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)
напрамках: 1 - 17 03 01-01 Інструментальная музыка
1-17 03 01-06 Прадзюсерства

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення навучальных
устаноў і кадраў Міністэрства
культуры Рэспублікі Беларусь
______________Н.Ю.Шмакава
"____"_____________2010 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай
і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_________________Ю.І.Міксюк
"____"___________2010 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб'яднання вышэйшых
навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь
па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
_____________ Б.У.Святлоў
"___"____________2010 г.

Рэктар дзяржаўнай установы
адукацыі "Рэспубліканскі
інстытут вышэйшай школы"
____________М.І.Дзямчук
"____"___________2010 г.

Эксперт-нормакантралёр
____________ _________
"_____"______________2010 г.

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*М.В. Белова,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* мастацкай творчасці і прадзюсерства прыватнай установы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава”;

*В.М.Зяленін,* прафесар кафедры скрыпкі ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 1 ад 29.08.2008 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 08.12. 2009 г.);

навукова-метадычным саветам па мастацтве музыкі Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 3 ад 16.12.2008 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *М.В.Белова*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Спецінструмент (скрыпка, альт)” з’яўляецца важнейшай для студэнтаў напрамку “інструментальная музыка”. У рамках гэтай дысцыпліны здзяйсняецца падрыхтоўка высокапрафесійных музыкантаў, якія здольны на сучасным узроўні ажыццяўляць выканальніцкую і педагагічную дзейнасць.

“Спецінструмент (скрыпка, альт)” цесна ўзаемазвязаны з такімі спецыяльнымі дысцыплінамі, як “Інструментальны ансамбль”, “Імправізацыя”, “Аркестравы клас”, “Інструментоўка”, “Дырыжыраванне”, “Фартэпіяна”.

Праграма “Спецінструмент (скрыпка, альт)” прадугледжвае вывучэнне складаных прафесійных выканальніцкіх задач, улічваючы індывідуальныя асаблівасці кожнага студэнта, у тым ліку ступень яго адоранасці, агульнае і музычнае развіццё, кругагляд, спецыяльную падрыхтоўку, псіхалагічныя асаблівасці.

*Галоўная мэта* дысцыпліны – падрыхтоўка спецыялістаў да самастойнай, прафесійнай і музычна-асветніцкай дзейнасці, набыццё імі ведаў і ўменняў у сферы музычнага выканаўства і педагогікі.

*Галоўнымі задачамі* дысцыпліны з’яўляюцца:

– фарміраванне мастацкага густу, музычна-выканальніцкай культуры, творчай індывідуальнасці, інтарэсу да выканальніцкіх традыцый;

– выхаванне творчай дысцыпліны, выканальніцкай волі, ініцыятыўнасці;

– набыццё ўмення рацыянальна арганізоўваць заняткі, самастойна засвойваць вучэбны матэрыял, фарміраваць рэпертуар;

– развіццё ўстойлівай базы навыкаў і ўменняў для вырашэння шырокага дыяпазону мастацкіх і тэхналагічных праблем, што ўзнікаюць у працэсе творчай і педагагічнай дзейнасці.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій выкладання курса “Спецінструмент (скрыпка, альт)” належыць выдзеліць: камунікатыўныя тэхналогіі (індывідуальныя заняткі, майстар-класы, канцэрты, конкурсы); метады аналізу выканальніцкіх задач, выпрацоўкі навыкаў самакантролю і самакарэкцыі; імітацыя і ўзнаўленне гукаінтанацыйнага паказу ва ўмовах камунікатыўнай сітуацыі.

Для ўдасканалення выканальніцкага майстэрства вучэбны рэпертуар павінен уключаць творы розных стыляў і напрамкаў акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі. Таксама кожны студэнт павінен вывучаць музычныя творы розных жанраў і формаў, поліфанію. Базай для дасягнення тэхнічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасканаласці павінна з’яўляцца работа над інструктыўным матэрыялам (практыкаванні, гамы, эцюды).

Выканальніцкая практыка студэнта павінна ажыццяўляцца пастаянна, яна прадугледжвае розныя формы, у тым ліку і адкрытыя канцэрты.

Выкладанне дысцыпліны “Спецінструмент (скрыпка, альт)” грунтуецца на непарыўнай сувязі тэорыі з практыкай.

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва эстрады накіраваны на авалоданне студэнтамі *ведамі і ўменнямі,* якія дазволяць на высокім узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– акустычныя і мастацкія магчымасці інструмента;

– прынцыпы і метады прафесійнага авалодвання выканальніцкай тэхнікай;

– жанры, формы і стылі акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі;

– прыкладныя аспекты выканальніцкай тэхнікі;

– метады дасягнення прафесійных задач;

– мастацка-вобразныя аспекты выканання твора;

– прынцыпы самастойнай работы над творам.

Выпускнік павінен *умець:*

– карыстацца акустычнымі і мастацкімі магчымасцямі інструмента;

– прафесійна валодаць выканальніцкай тэхнікай;

– арыентавацца ў стылявых напрамках сучаснай музычнай культуры і выконваць на прафесійным узроўні сольную праграму з твораў беларускіх, рускіх, заходнееўрапейскіх і амерыканскіх кампазітараў розных жанраў, формаў і стыляў;

– самастойна працаваць над творам у працэсе стварэння выканальніцкай інтэрпрэтацыі;

– чытаць ноты з ліста і транспанаваць твор у розныя танальнасці.

Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне “Спецінструмент (скрыпка, альт)” у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам для напрамку “інструментальная музыка” складае 730 гадз., з якіх 310 гадз. адведзены на аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі, 420 гадз. – на самастойную работу студэнтаў; для напрамку “прадзюсерства” – 350 гадз., з якіх 150 гадз. адведзены на аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі, 200 гадз. – на самастойную работу студэнтаў. Веды і практычныя навыкі студэнтаў кантралююцца ў працэсе навучання (залікі, экзамены), а таксама пры арганізацыі пазааўдыторнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць індывідуальных гадзін | |
|---|---|---|
| | напрамак 1-17 03 01-01 Інструментальная музыка | напрамак 1-17 03 01-06 Прадзюсерства |
| **Раздзел I. Агульныя элементы музычнага выканаўства на струнных інструментах** | | |
| ***Тэма 1.*** Агульная і індывідуальная пастаноўка тэхнічнага апарату музыканта | 8 | – |
| ***Тэма 2.*** Метр і рытм як элементы музычнага выканаўства | 10 | 13 |
| ***Тэма 3.*** Арнаментыка | 6 | 3 |
| ***Тэма 4.*** Артыкуляцыя | 8 | 3 |
| ***Тэма 5.*** Дынаміка, тэмбр | 8 | 5 |
| ***Тэма 6.*** Тэмп і яго змяненні (агогіка) | 6 | 5 |
| ***Тэма 7.*** Фразіроўка | 8 | 4 |
| **Раздзел II. Музычна-выканальніцкая тэхніка** | | |
| ***Тэма 1.*** Гуказдабыванне | 18 | 12 |
| ***Тэма 2.*** Вібрацыя як сродак музычнай выразнасці | 14 | 6 |
| ***Тэма 3.*** Аплікатура і яе магчымасці | 16 | 8 |
| ***Тэма 4.*** Інтанацыя | 16 | 8 |
| ***Тэма 5.*** Рухальная тэхніка правай і левай рукі. Штрыхі, іх класіфікацыя | 20 | 16 |
| **Раздзел III. Фарміраванне асноў выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар** | | |
| ***Тэма 1.*** Інструктыўны матэрыял (практыкаванні, гамы, эцюды) | 32 | 15 |
| ***Тэма 2.*** Вывучэнне твораў буйной формы (канцэрты, санаты, варыяцыі, сюіты) | 48 | 15 |
| ***Тэма 3.*** Творы малой формы (гамафонна-гарманічны і поліфанічны склады) | 46 | 15 |
| ***Тэма 4.*** Падрыхтоўка да эстраднага выступлення | 12 | 2 |
| ***Тэма 5.*** Тэхніка чытання нот з ліста | 8 | 6 |
| **Раздзел IV. Асаблівасці выканання: каноны музычных стыляў і жанраў** | 10 | 8 |
| **Раздзел V. Навыкі ансамблевага выканаўства** | 10 | – |
| **Раздзел VI. Захаванне і манціроўка інструмента** | 6 | 6 |
| **Усяго…** | **310** | **150** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел I. Агульныя элементы музычнага выканаўства на струнных інструментах

### *Тэма 1. Агульная і індывідуальная пастаноўка тэхнічнага апарату музыканта*

Пастаноўка як працэс выпрацоўкі рацыянальных прыёмаў ігры на інструменце. Тыповыя формы, агульныя прынцыпы сучаснай пастаноўкі. Развіццё мэтазгоднай пастаноўкі ў працэсе прыстасавання арганізма музыканта да патрабаванняў выканальніцкай тэхнікі. Перспектыўнасць пастаноўкі. Фізічныя ўласцівасці рук, мышачна-рухальны апарат у цэлым і ступень прыстасаванасці яго да інструмента. Дасягненне поўнай незалежнасці ў дзейнасці рук, рацыянальнае размеркаванне нагрузкі паміж часткамі рукі. Уплыў асаблівасцей будовы плечавога пояса і рук на форму пастаноўкі ў цэлым, і ў сувязі з гэтым індывідуальнасць пастаноўкі музыканта. Раўнамернае размеркаванне вагі корпуса.

### *Тэма 2. Метр і рытм як элементы музычнага выканаўства*

Роля рытму ў працоўных працэсах і мастацкай творчасці. Рытм і ўпарадкаванае расчляненне рухаў у часавых адносінах. Формаўтваральнае значэнне рытму і яго сувязь з асаблівасцямі і характарам музычнага твора. Развіццё рытмічнага пачуцця. Аналіз метрарытмічнай структуры выконваемага музычнага твора як важнейшая ўмова развіцця рытмічнага пачуцця ў студэнта. Значэнне актыўнага слыхавога кантролю.

Метр як мера рытму, тэмп як скорасць чаргавання метрычных долей. Вызначэнне метра і тэмпу ў нотным тэксце. Выразнае значэнне паўз.

### *Тэма 3. Арнаментыка*

Гісторыя развіцця ўсіх відаў музычных украсаў. Неабходнасць знаёмства з арнаментыкай з улікам сучасных рэдакцыйных традыцый. Віды музычных украсаў, “расквечванне” мелодыі; выяўленне эмацыянальнага эфекту, структурнага элемента меладычнай лініі. Вызначэнне стылю і зместу твора з улікам канкрэтных метадаў выканання арнаментальных абазначэнняў. Паняцці “фаршлаг”, “мардэнт”, “групета”, “трэль”, “нахшлаг”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Артыкуляцыя*

Артыкуляцыя як складанае або раздзельнае выкананне гукаў, ствараючых матыў, музычную фразу. Уплыў змены смычка на артыкуляцыю. Правільнае размеркаванне смычка – залог паспяховай артыкуляцыі. Метады вызначэння артыкуляцыі ў нотах.

### *Тэма 5. Дынаміка, тэмбр*

Дынаміка як адзін з асноўных элементаў музычнай выразнасці. Значэнне выхавання дыферэнцыраваных адчуванняў сілы гуку і паступовага яго змянення. Неабходнасць слыхавога кантролю за гукам на ўсёй яго працягласці. Паняцце аб асноўных дынамічных адценнях. Асноўныя віды дынамічных акцэнтаў, іх мастацкае выкарыстоўванне. Дынамічныя кантрасты. Дынаміка і тэмбр. Шумы і музыкальныя гукі. Паняцце аб асноўным тоне і частковых тонах (абертонах). Розныя адценні і тэмбры гукаў, іх уплыў на слых. Вывучэнне ўсіх рэгістраў і тэмбру інструмента. Дынаміка гуку.

### *Тэма 6. Тэмп і яго змяненні (агогіка)*

Мера часу, якая вызначае фактычную працягласць гукаў у музычным творы. Абазначэнне тэмпаў з дапамогай умоўных знакаў або спецыяльных тэрмінаў. Індывідуальнасць тэмпавага выканання. Адзінства тэмпу і магчымасці адхілення ад яго. Правільны тэмп як сродак раскрыцця мастацкага зместу музычнага твора. Адсутнасць сувязі тэмпу з дынамічнымі змяненнямі. Агогіка – адхіленне ад асноўнага тэмпу і рытму, абумоўленае жывым, творчым характарам усяго выканальніцкага працэсу. Кульмінацыйныя ўзлёты і спады. Мастацкая выканальніцкая сталасць і правільны выбар тэмпаў.

### *Тэма 7. Фразіроўка*

Мелодыя, яе вядучае значэнне ў музычным творы, работа над ёй. Значэнне аналізу структуры музычнай фразы для правільнага чытання нотнага тэксту і раскрыцця зместу музычнага твора. Вызначэнне музычных фраз пры выкананні музычных твораў. Мастацкія сродкі фразіроўкі. Абавязковае захаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтарскіх указанняў у нотным тэксце як адна з асноў мастацтва інтэрпрэтацыі. Неразрыўная сувязь розных музычных знакаў з музычнай думкай – фразай.

## Раздзел II. Музычна-выканальніцкая тэхніка

### *Тэма 1. Гуказдабыванне*

Гуказдабыванне на смычковых музычных інструментах. Фактары тэхнічнага характару, якія ўплываюць на сілу і якасць гуку: хуткасць руху смычка, сіла націску яго на струну і выбар участка струны для гуказдабывання. Роля музычна-мастацкага прадстаўлення, залежная роля рухальна-ігравых элементаў у працэсе гуказдабывання. Гукавая дынаміка. Тэмбравае афарбоўванне гуку. Слыхавы кантроль над гуказдабываннем.

### *Тэма 2. Вібрацыя як сродак музычнай выразнасці*

Вібрацыя – выканальніцкі навык, мастацкі элемент ігры на інструменце. Уплыў вібрацыі на тэмбр, сілу і якасць гуку. Сувязь вібрацыі з эмацыянальнасцю выканання, тэмбрам і дынамікай гучання. Адпаведнасць характару вібрацыі зместу і стылю выконваемага музычнага твора. Тэмп і амплітуда вібрацыі, залежнасць ад розных выканальніцкіх задач. Віды вібрацыі: локцевая, кісцевая, змешаная. Асноўныя метады вывучэння вібрацыі. Амплітуда, частата, форма руху ў розных рэгістрах, пазіцыях. Значэнне свабоды і эластычнасці пальцаў левай рукі для развіцця вібрацыі.

### *Тэма 3. Аплікатура і яе магчымасці*

Аплікатура як сродак мастацкай выразнасці і як тэхнічны сродак. Прынцыпы падбору аплікатуры, сувязь з метрам і рытмам. Індывідуальная аплікатура. Сувязь аплікатуры з інтанацыяй, дынамікай. Віды аплікатуры. Выкарыстанне пазіцый і паўпазіцый, міжпазіцыйная ігра. Аплікатурныя мадэлі. Эвалюцыя аплікатурных сістэм. Аналіз аплікатуры ў розных выданнях і метадычных дапаможніках.

### *Тэма 4. Інтанацыя*

Дакладнасць інтанавання – неабходная ўмова выканання, сродак мастацкай выразнасці. Паняцце дакладнай інтанацыі ў музычна-мастацкім і акустычным сэнсе. Натуральны гукарад і тэмпераваны строй. Сувязь інтанацыі і стылю выконваемай музыкі. Вучэнне аб зоннай прыродзе слыхавых успрыманняў (Н.Гарбузаў). Праблемы інтанавання на інструментах з нефіксаваным строем. Работа над інтанацыяй у мастацкім і тэхнічным планах. Найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характэрныя памылкі інтанавання, метады іх выпраўлення. Роля слыху, які кіруе інтанацыяй і кантралюе яе.

### *Тэма 5. Рухальная тэхніка правай і левай рукі. Штрыхі, іх класіфікацыя*

Якасць гуку як вынік правільнага музычна-слыхавога ўяўлення і мэтазгоднай работы ўсіх частак правай рукі пры пастаянным слыхавым кантролі. Сродкі музычнай выразнасці. Уздзеянне смычка на струну, дасягненне натуральнасці гуку. Роля пастаноўкі і рухаў правай рукі пры гуказдабыванні, адчуванне вагі рукі як асновы гуказдабывання. Мышцы пляча – крыніца сілы. Роля перадплечча, кісці і пальцаў рукі ў карэкціроўцы рухаў смычка. Схема рухаў частак правай рукі пры вядзенні смычка. Асноўныя віды штрыхоў і іх значэнне як сродкаў музычна-мастацкай выразнасці. Тэхніка плаўных штрыхоў: дэташэ, легата; прынцыпы мастацкага выкарыстоўвання гэтых штрыхоў. Адрывістыя штрыхі: мартэле, стаката, тэхніка іх выканання. Прыгаючыя штрыхі: спіката, саціе, лятучае стаката, рыкашэт. Змешаныя штрыхі. Дэкламацыйна-выразная сутнасць штрыхоў.

## Раздзел III. Фарміраванне асноў выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар

### *Тэма 1. Інструктыўны матэрыял (практыкаванні, гамы, эцюды)*

Навучальная роля інструктыўнага матэрыялу. Псіхафізіялагічная сутнасць працэсу практыкаванняў. Выхаванне навыкаў выканання дакладных іграваых рухаў, іх натуральнасць і прастата ігры на прыкладзе інструктыўнага матэрыялу. Работа над тэхнікай: паслядоўнае набыццё новых прыёмаў ігры, іх разнастайных спалучэнняў, авалоданне вызначанымі прыёмамі, неабходнымі пры выкананні канкрэтнага твора. Прынцып паступовасці і паслядоўнасці накаплення навыкаў як асновы сістэматычнай работы над тэхнікай. Сэнс практыкаванняў і іх месца ў рабоце на розных этапах навучання. Неабходнасць адзінства тэхнічнага і мастацкага развіцця студэнта. Работа над бегласцю і кантыленай, спасціжэнне гучальнай, выразнай тэхнікі. Неабходнасць індывідуальнага падбору найбольш цэнных і тэхнічна-разнастайных эцюдаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Тэма 2. Вывучэнне твораў буйной формы (канцэрты, санаты, варыяцыі, сюіты)*

Асаблівасці і змест работы ў розныя перыяды вывучэння музычных твораў. Спецыфіка выканання буйной формы. Асноўныя этапы работы: агульнае азнаямленне, стылістычная сутнасць, змест і форма. Работа над удасканальваннем тэхнічнага боку твораў і мастацкай апрацоўкай дэталей. Выбар выканальніцкіх сродкаў выразнасці, якія адпавядаюць зместу вывучаемага твора. Работа над канкрэтнымі фрагментамі, закончанымі часткамі і цэлым мастацкім творам.

### *Тэма 3. Творы малой формы (гамафонна-гарманічны і поліфанічны склады)*

Неабходнасць выканаўства п’ес малой формы ў працэсе навучання. Абавязковае вывучэнне твораў кампазітараў розных стыляў і эпох для выхавання пачуцця стылю і адчування характару музыкі, азнаямленне з шырокім кругам класічнай і сучаснай музычнай літаратуры малой формы. Спецыфіка яе выканання. Выхаванне выканальніцкай волі, фарміраванне творчай індывідуальнасці ў працэсе сумеснай работы выкладчыка і студэнта. Накапленне рэпертуару як форма падрыхтоўкі студэнта да практычнай выканальніцкай дзейнасці. Работа над творамі поліфанічнага складу, капрысамі, іх значэнне ў тэхнічным і музычным станаўленні выканаўцы.

### *Тэма 4. Падрыхтоўка да эстраднага выступлення*

Зразумеласць мастацкага зместу і мэты як неабходная ўмова падрыхтоўкі да эстраднага выступлення. Асаблівасці псіхалагічнага і фізіялагічнага стану на эстрадзе. Эстраднае і перадэстраднае хваляванне, рэжым. “Эстрадны тонус”. Формы праяўлення хвалявання і метады яго пераадолення. Канцэнтрацыя творчай увагі на змесце і характары твора – сродак барацьбы з эстрадным хваляваннем.

### *Тэма 5. Тэхніка чытання нот з ліста*

Чытанне нот з ліста як фактар, што развівае выканальніцкія навыкі. Умова паступовага ўскладнення чытаемага нотнага матэрыялу. Прынцыпы чыткі і іх значэнне для прафесійнага станаўлення музыканта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV. Асаблівасці выканання: канoны музычных стыляў і жанраў

Агульныя прынцыпы музычнай эстэтыкі, іх прымяненне да інтэрпрэтацыі музычных твораў. Асаблівасці выканання музыкі эпох: барока, класіцызму, рамантызму, музыкі сучасных, беларускіх кампазітараў. Вывучэнне манеры пісьма, асаблівасцей формы, фактуры музычнага твора, яго прыналежнасці да таго або іншага жанру. Узнаўленне ў выканаўстве  характэрных рысаў музычнага стылю. Мнагазначнасць паняцця “музычны стыль”. Нацыянальны каларыт. Спасціжэнне сутнасці самых розных мастацкіх напрамкаў, набыццё ўмення перадаваць іх характэрныя асаблівасці. Неабходнасць навучання ігры ў розных жанрах. Роля інтуіцыі ў выканальніцкім працэсе.

## Раздзел V. Навыкі ансамблевага выканаўства

Творчая дысцыпліна, слыхавы самакантроль, узаемаразуменне, уменне слухаць і трактаваць сваю партыю як частку цэласнага музычнага вобраза – прынцыпы ансамблевага выканаўства. Адзінства тэмпу, штрыхоў, дынамікі, суадносін галасоў, чыткі з ліста, раскрыцця ідэйна-мастацкай задумы выконваемага твора. Прынцып паступовасці і паслядоўнасці навучання ансамблеваму выканаўству.

## Раздзел VI. Захаванне і манціроўка інструмента

Набыццё навыкаў па абслугоўванні інструмента. Веданне канструкцыйна-акустычнага прынцыпу будовы інструмента. Варыянты рэстаўрацыйных работ, прынцыпы іх выканання. Уплыў стану інструмента на якасць гуку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Ауэр, Л.* Моя школа игры на скрипке /Л. Ауэр. – М., 1965. – 270 с.

2. *Берлянчик, М.* О развитии интонационного слуха исполнителя / М.Берлянчик // Вопросы воспитания музыкального слуха. – Л.: Музыка, 1987. – С. 20–43.

3. *Бернштейн, Б.* О построении движений / Б.Бернштейн. – М.: Музыка, 1947. – 68 с.

4. *Благовещенский, И.* Из истории скрипичной педагогики / И.Благовещенский. – Мн.: Вышэйш. шк., 1980. – 77 с.

5. *Верхолаз Р.* Вопросы методики чтения нот с листа / Р.Верхолаз. – М.: Музыка, 1969. – 140 с.

6. *Гарбузов, Н.* Зонная природа звуковысотного слуха / Н.Гарбузов. – М.; Л.: Музыка, 1948. – 56 с.

7. *Григорьев, В.* Самостоятельная работа по специальности: принципы и методы / В.Григорьев. – Л.: Музыка, 1979. – 78 с.

8. *Григорьев, В.* Методика обучения игры на скрипке / В.Григорьев. – М.: Музыка, 2006. – 284 с.

9. *Гутников, Б.* Об искусстве скрипичной игры / Б.Гутников. – Л.: Музыка, 1988. – 53 с.

10. *Капилов, А.* Скрипка белорусская / А.Л.Капилов. – Мн.: Беларусь, 1982. – 92 с.

11. *Либерман, М.* Культура звука скрипача: пути формирования и развития / М.Либерман, М.Берлянчик. – М.: Музыка, 1985. –112 с.

12. *Мострас, К.* Интонация на скрипке / К.Мострас. – Л.: Музыка, 1948. – 83 с.

13. *Мострас, К.* Динамика в скрипичном искусстве / К.Мострас. – Л.: Музыка, 1956. – 47 с.

14. *Переверзев, Н.* Исполнительская интонац+ия / Н.Переверзев. – М.: Музыка, 1989. – 53 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*15. Сраджев В*. Еще раз о свободе игрового аппарата инструменталиста / В.Сраджев // Исполнительское искусство: виолончель, контрабас, арфа: сборник трудов. – М.: ГМПИ им. Гнесиных, 1992. – Вып. 119. – С. 80–101.

*16. Струве, Б.* Вибрация как исполнительский навык игры на смычковых инструментах / Б.Струве. – Л.: Музыка, 1933. – 85 с.

*17. Флеш, К.* Искусство скрипичной игры / К.Флеш. – М.: Классика –XXI, 2004. – 301 с.

*18. Хасанова, В.* Музыкальный ритм / В.Хасанова. – М.: Музыка, 1980. – 50 с.

*19. Шульпяков, О*. О психофизическом единстве исполнительского искусства / О.Шульпяков. – Л.: Советский композитор, 1973. – 117 с.

*20. Шульпяков, О.* Техническое развитие музыканта-исполнителя / О.Шульпяков. – Л.: Музыка, 1973. – 103 с.

*21. Ямпольский, И.* Основы скрипичной аппликатуры / И.Ямпольский. – М.: Музыка, 1965. – 190 с.

*22. Янкелевич, Ю.* Педагогическое наследие / Ю.Янкелевич. – М.: Музыка, 2002. – 317 с.

*Дадатковая*

*1. Гольденвейзер, А.* О музыкальном исполнительстве / А.Гольденвейзер. – М.: Музгиз, 1956. – 121 с.

*2. Мазель, Л.* Строение музыкальных произведений / Л.Мазель. – М.: Музыка, 1979. – 77 с.

*3. Сидельников, Л.* Симфоническое исполнительство / Л.Сидельников. – М.: Советский композитор, 1991. – 283 с.

*4. Юзефович, В.* Д.Ойстрах. Беседы с И.Ойстрахом / В.Юзефович. – М.: Музыка, 1985. – 315 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СПЕЦІНСТРУМЕНТ**
**(скрыпка, альт)**

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці**
1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)
напрамках 1-17 03 01-01 Інструментальная музыка
1-17 03 01-06 Прадзюсерства

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. .
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: дзённая форма атрымання адукацыі

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | індыві-дуальныя | КСР | |
| Уводзіны ў дысцыпліну | 1 | 1 | | |
| **Раздзел I. Агульныя элементы музычнага выканаўства на струнна-смычковых інструментах** | | | | |
| *Тэма 1* Удасканальванне пастаноўкі і свабоды ігравога апарата | 20 | 20 | | |
| *Тэма 2*. Метрарытм | 20 | 13 | 7 | залік |
| *Тэма 3*. Штрыхавыя асаблівасці у розных стылях акадэмічнай і джазавай музыкі | 30 | 22 | 8 | экзамен |
| *Тэма 4*. Сувязь штрыхоў і рытмікі з характарам музычнага твора | 19 | 19 | | |
| **Раздзел II. Музычна-выканальніцкая тэхніка** | | | | |
| *Тэма 5.* Тэхніка правай рукі. Гуказдабыванне, штрыхі, артыкуляцыя, дынаміка, агогіка. | 20 | 14 | 6 | кантрольны урок |
| *Тэма 6.* Тэхніка левай рукі. Інтанаванне, вібрата, аплікатура, тэхніка выканання двайных нот, акордавая тэхніка | 30 | 24 | 6 | кантрольны урок |
| *Тэма 7.* Асобыя прыёмы ігры на інструменце | 12 | 12 | | |
| **Раздзел III. Асновы выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар** | | | | |
| *Тэма 8*. Творы акадэмічнай музыкі буйной формы | 40 | 32 | 8 | зкзамен |
| *Тэма 9*. Творы акадэмічнай музыкі малой формы | 30 | 23 | 7 | акадэмічны канцэрт |
| *Тэма 10*. Інструктыўны матэрыял | 20 | 14 | 6 | залік |
| *Тэма 11*. Падрыхтоўка да эстраднага выканальніцтва | 10 | 10 | | |
| *Тэма 12*. Тэхніка чытання нот з ліста | 20 | 20 | | |
| **Раздзел IV. Навыкі ансамблевага выканальніцтва ў класе спецінструмента** | 10 | 5 | | |
| **Раздел V. Асаблівасці выканання музыкі розных стыляў і жанраў** | 10 | 7 | 8 | зкзамен |
| **Усяго…** | **292** | **236** | **56** | **Залік, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны: завочная форма атрымання адукацыі

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|
| | індывідуальныя заняткі | |
| Уводзіны ў дысцыпліну | 1 | |
| **Раздзел I. Агульныя элементы музычнага выканаўства на струнна-смычковых інструментах** | | |
| *Тэма 1* Удасканальванне пастаноўкі і свабоды ігравога апарата | 2 | |
| *Тэма 2*. Метрарытм | 3 | |
| *Тэма 3*. Штрыхавыя асаблівасці у розных стылях акадэмічнай і джазавай музыкі | 8 | |
| *Тэма 4*. Сувязь штрыхоў і рытмікі з характарам музычнага твора | 2 | |
| **Раздзел II. Музычна-выканальніцкая тэхніка** | | |
| *Тэма 5.* Тэхніка правай рукі. Гуказдабыванне, штрыхі, артыкуляцыя, дынаміка, агогіка. | 6 | |
| *Тэма 6.* Тэхніка левай рукі. Інтанаванне, вібрата, аплікатура, тэхніка выканання двайных нот, акордавая тэхніка | 7 | |
| *Тэма 7.* Асобыя прыёмы ігры на інструменце | 2 | |
| **Раздзел III. Асновы выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар** | | |
| *Тэма 8*. Творы акадэмічнай музыкі буйной формы | 10 | |
| *Тэма 9*. Творы акадэмічнай музыкі малой формы | 10 | |
| *Тэма 10*. Інструктыўны матэрыял | 4 | |
| *Тэма 11*. Падрыхтоўка да эстраднага выканальніцтва | **4** | |
| *Тэма 12*. Тэхніка чытання нот з ліста | **2** | |
| **Раздзел IV. Навыкі ансамблевага выканальніцтва ў класе спецінструмента** | **3** | |
| **Раздел V. Асаблівасці выканання музыкі розных стыляў і жанраў** | **4** | |
| **Усяго…** | **68** | **Залік, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 Асноўная літаратура (скрыпка)


*1. Ауэр, Л.* Моя школа игры на скрипке /Л. Ауэр. – М., 1965. – 270 с.

*2. Берлянчик, М.* О развитии интонационного слуха исполнителя / М.Берлянчик // Вопросы воспитания музыкального слуха. – Л.: Музыка, 1987. – С. 20–43.

*3. Бернштейн, Б.* О построении движений / Б.Бернштейн. – М.: Музыка, 1947. – 68 с.

*4. Благовещенский, И.* Из истории скрипичной педагогики / И.Благовещенский. – Мн.: Вышэйш. шк., 1980. – 77 с.

*5. Верхолаз Р.* Вопросы методики чтения нот с листа / Р.Верхолаз. – М.: Музыка, 1969. – 140 с.

*6. Гарбузов, Н.* Зонная природа звуковысотного слуха / Н.Гарбузов. – М.; Л.: Музыка, 1948. – 56 с.

*7. Григорьев, В.* Самостоятельная работа по специальности: принципы и методы / В.Григорьев. – Л.: Музыка, 1979. – 78 с.

*8. Григорьев, В.* Методика обучения игры на скрипке / В.Григорьев. – М.: Музыка, 2006. – 284 с.

*9. Гутников, Б.* Об искусстве скрипичной игры / Б.Гутников. – Л.: Музыка, 1988. – 53 с.

*10. Капилов, А.* Скрипка белорусская / А.Л.Капилов. – Мн.: Беларусь, 1982. – 92 с.

*11. Либерман, М.* Культура звука скрипача: пути формирования и развития / М.Либерман, М.Берлянчик. – М.: Музыка, 1985. –112 с.

*12. Мострас, К.* Интонация на скрипке / К.Мострас. – Л.: Музыка, 1948. – 83 с.

*13. Мострас, К.* Динамика в скрипичном искусстве / К.Мострас. – Л.: Музыка, 1956. – 47 с.

*14. Переверзев, Н.* Исполнительская интонац+ия / Н.Переверзев. – М.: Музыка, 1989. – 53 с.

*15. Сраджев В.* Еще раз о свободе игрового аппарата инструменталиста / В.Сраджев // Исполнительское искусство: виолончель, контрабас, арфа: сборник трудов. – М.: ГМПИ им. Гнесиных, 1992. – Вып. 119. – С. 80–101.

*16. Струве, Б.* Вибрация как исполнительский навык игры на смычковых инструментах / Б.Струве. – Л.: Музыка, 1933. – 85 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Флеш, К.* Искусство скрипичной игры / К.Флеш. – М.: Классика –XXI, 2004. – 301 с.

*18. Хасанова, В.* Музыкальный ритм / В.Хасанова. – М.: Музыка, 1980. – 50 с.

*19. Шульпяков, О*. О психофизическом единстве исполнительского искусства / О.Шульпяков. – Л.: Советский композитор, 1973. – 117 с.

*20. Шульпяков, О.* Техническое развитие музыканта-исполнителя / О.Шульпяков. – Л.: Музыка, 1973. – 103 с.

*21. Ямпольский, И.* Основы скрипичной аппликатуры / И.Ямпольский. – М.: Музыка, 1965. – 190 с.

*22. Янкелевич, Ю.* Педагогическое наследие / Ю.Янкелевич. – М.: Музыка, 2002. – 317 с.

## 5.5 Дадатковая літаратура (скрыпка)

*1. Гольденвейзер, А.* О музыкальном исполнительстве / А.Гольденвейзер. – М.: Музгиз, 1956. – 121 с.

*2. Мазель, Л.* Строение музыкальных произведений / Л.Мазель. – М.: Музыка, 1979. – 77 с.

*3. Сидельников, Л.* Симфоническое исполнительство / Л.Сидельников. – М.: Советский композитор, 1991. – 283 с.

*4. Юзефович, В.* Д.Ойстрах. Беседы с И.Ойстрахом / В.Юзефович. – М.: Музыка, 1985. – 315 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.6 Асноўная літаратура (альт)


1. Безруков, Г. Гаммы и арпеджио для альта / Г. Безруков, К. Ознобищев. — М., 1974.
2. Безруков, Г. Основы техники игры на альте / Г. Безруков, К. Ознобищев. — М., 1973.
3. Бруни, А. Б. Школа для альта (ред. В. Борисовского) / А. Б. Бруни. — М., 1930.
4. Гинзбург, Л. С. О работе над музыкальным произведением / Л. С. Гинзбург. — М., 1981.
5. Григорьев, В. Ю. Методика обучения игре на скрипке / В. Григорьев – М., 2006.
6. Ляховицкая, С. О педагогическом мастерстве / С. Ляховицкая. — Л., 1963.
7. Назайкинский, Е. О психологии музыкального восприятия / Е. Назайкинский. — М., 1972.
8. Рейтих, М. Школа юного альтиста / М. Рейтих. — М., 1987.


## 5.7 Дадатковая літаратура (альт)


1. Агарков, О. Вибрато / О. Агарков. — М., 1960.
2. Грицюс, А. Методические комментарии к 42-м этюдам Р. Крейцера / А. Грицюс. — Вильнюс, 1964.
3. Либерман, М. Некоторые вопросы техники развития левой руки / М. Либерман // Вопросы музыкальной педагогики. — Новосибирск, 1973.
4. Мострас, К. Г. Изучение позиций и переходов / К. Г. Мострас. — М., 1960.
5. Струве, Б. А. Типовые формы постановки рук у инструменталистов. Смычковая группа / Б. А. Струве. — М.; Л., 1932.
6. Теплов, Б. М. Психология музыкальных способностей / Б. М. Теплов. — М., 1948.
7. Цагарелли, Ю. А. Психология музыкально-исполнительской деятельности / Ю. А. Цагарелли. – СПб., 2008.
8. Штейнгаузен, Ф. Физиология ведения смычка / Ф. Штейнгаузен. — М., 1930.
9. Шульпяков, О. Ф. Техническое развитие музыканта-исполнителя / О. Ф. Шульпяков. — СПб., 2006.
10. Ямпольский, А. И. О методе работы с учениками / А. И. Ямпольский. — М., 1968.
11. Янкелевич, Ю. И. Педагогическое наследие / Ю. И. Янкелевич. — М., 1993.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ